# ПАДАРОЖЖА ПА ПРЫПЯЦЬ

Чарговая сустрэча аб'яднада сяброў АПБ з Гродна і Маілёва, Турава і Барысава, Янава і Брэста, Сянно і Кобрына. Адбылася яна ў пачатку жніўня ў Мікашэвічах (Брэсцкая вобласць).



Але гэта сустрэча была арганізавана не зусім звычайна - на плыце. Плыт з вялікіх аўтамабільных камер ад "белазаўскіх" колаў зрабілі ўмельцы-турысты з мясцовага турклубу "Граніт". Дапамогу Мікалая Бабковіча, Васіля Юнгава і Аляксандра Крывульца цяжка пераацэніць - шчыры ім дзякуй! Але галоўным арганізатарам і нязменным стырнавым плыта быў Мікалай Лаўнікові - без яго наша цудоўнаё падарожжа папросту не адбылося б.

Пачатак падарожжа - невялічкая спрамленая рака Цна - прыток Прыпяці, канечны прыпынак - канал, які вядзе да Мікашэвічаў: адлегласць паміж гэтымі кропкамі склала больш за 70 км. Але вызначыць, дзе пачыналася падарожжа і дзе яно падыйшло да лагічнага завяршэння - гэта значыць нічога не сказаць. Падчас вандроўкі панавала сяброўская атмасфера і нават не вельмі спрыяльнае пахмурнае надвор'е не стала перашкодай добраму настрою.

**ПРЫПЯЦЬ**

Што ж давялося пабачыць падчас падарожжа?

Па-першае, гэта сама прыгажуня Прыпяць, якую так цудоўна апісаў класік беларускай літаратуры Якуб Колас. Прыпяць уразіла сваёй непаўторнасцю і пераменлівасцю - то яна ласкавая, пяшчотная на сваіх хвалях калыхала сонечныя прамяні і ззяла тысячамі іскрыстых зайчыкаў; то пахмурная, шэрая незадаволена шпурляла хвалі адну за другой на пясчаныя берагі. Пад час дажджу здавалася раз'юшанай. А берагі Прыпяці! На тым адрэзку ракі, дзе пралягаў наш маршрут, яны



нізкія, заросшыя хмызняком і трыснягом. Дзе-нідзе трапляліся пясчаныя пляжы, на якіх было б добра паваляцца ў жоўтым цёплым пяску. Але надвор'е не спрыяла такому бестурботнаму правядзенню часу. І на гэтых пляжах мы сустракалі толькі кулікоў і чаек-рыбачак, якія з лямантам узнімаліся ў паветра пры набліжэнні нашага плыта. На больш высокіх берагах дываном расцілаліся травы, узвышаліся дрэвы.

Час ад часу па Прыпяці рухаліся буксіры з баржамі, нагружанымі шчэбнем з "Граніту", і тыя берагі, якія знаходзяцца каля фарватэру, адпрасаваны бартамі гэтых шматтонных барж. Справа ў тым, што буксір пхае перад сабой нагружаныя баржы, а на адваротным шляху пустыя "пасудзіны" цягнуцца за караблём і "боўтаюцца" па раце амаль самастойна. Спачатку і мы на плыце накіроўваліся да берага, трымаліся за кусты, каб не зацягнула пад баржу. Але потым сталі арыентавацца па гэтых адпрасаваных .берагах і калі чулі, што набліжаецца "канвой", трымаліся процілеглага берагу.

У радэ плёскаліся шчупакі і плоткі, вясёлымі чародкамі рухалася рыбная малеча. Неглыбокія пратокі Прыпяці прыцягвалі прыгажосцю белых і жоўтых гарлачыкаў. Падчас чарговага прыпынку ля берага, зарослага воднымі раслінамі, нам пашчасціла сустрэць сальвінію плывучую - водную папараць, якая занесена ў Чырвоную кнііу. Але цікавай была не толькі яна, але і павук-серабранка, які забраўся на ліст гарлачыка; ўюн, якога злавілі рукамі, а потым адпусцілі (загадаўшы жаданне); шэрая кугакаўка, якую ўратавалі з зялёнага палону, бо яна заблыталася крыламі ў сцяблах ажыны і бярозкі; амерыканская норка, што жвава пераплыла Прыпяць недалёка ад плыта, а потым імкліва знікла ў буйнай расліннасці. Цікавасць выклікала і палявіца пабеганосная, якая дываном разраслася па беразе і стужкамі цягнулася да вады.

**ПТУШКІ**

Зразумела, што для сябраў АПБ асабліва цікавыя птушкі.

Першай птушкай, якая выклікала спрэчкі з нагоды вызначэння быў сярэдні кулён. Гэты кулік зрабіў некалькі кругоў над намі, даў магчымасць разглядзець у бінокль сваю доўгую загнутую ўніз дзюбу і паслухаць мяккае «пью-цью, пью-цью ...», затым знік.

Пазней былі сустрэчы і з відамі, якія з'яўляюцца звычайнымі на тэрыторыі Беларусі, і з відамі, якія занесены ў Чырвоную кніiу. Так, у хмызняку хаваліся трысняговыя стрынаткі і чаротаўкі, па пясчаных пляжах бегалі белыя пліскі. Аднекуль з кустоў даносіліся спевы звычайнага цвыркуна і пячураўкі-будаўнічка. Нязвычна было на пачатку жніўня чуць кавалкі песні салаўя - напэўна, гэта маладыя птушкі спрабавалі свой голас.

Над плытом пралятaлі белашчокія рыбачкі з кормам ў дзюбах, бо іх птушаняты,

хаця і сталі на крыло, самастойна здабываць сабе ежу яшчэ не маглі (гэты від крычак гняздуецца пазней за іншыя). Мы не раз сустракалі маладых:
яны сядзелі на бакенах і, лянiва паглядваючы па баках, чакалі дарослых з рыбкамі.

На берагах, каля кустоў, або каля выкінутых ракой кавалкаў дрэў цікавалі рыбу белыя і шэрыя чаплі. Асобныя чароды налічвалі да дваццаці птушак. Пры набліжэнні плыта яны ўзнімаліся ў паветра і знікалі за хмызняком.

У адзін з вечароў недалёка ад нашых намётаў праляцела чародка чапляў-квакваў, якіх сапраўды можна было пазнаць па іх голасу.

Чорныя буслы, у адрозненне ад чапляў, птушкі больш асцярожныя, назіраць іх можна было толькі высока ў паветры, дзе яны ляталі, раскінуўшы шырокія крылы.

Што можа быць лепш і прыгажэй для назіральніка за птушкамі і для сапраўднага арнітолага за тое, чым убачыць гордыя постаці арланаў-белахвостаў на вершалінах дубоў. Якія пачуцці ўзнікаюць у чалавека, калі ён чуе крык пугача ўначы?

Пад канец падарожжа недалёка ад Мікашэвіч адбылася сустрэча з крычкай-чэгравай. Пры набліжэнні плыта да чарговай пясчанай касы самыя апантаныя назіральнікі за птушкамі звычайна хапаліся за біноклі і разглядвалі чародкі птушак, якія займалі тую касу. Так было і на гэты раз: пясчаны пляж быў нібыта пакрыты белым воблакам - гэта адпачывалі чайкі-рыбачкі, а сярод іх, бліжэй да вады, вызначаліся крычкі-чэгравы сваімі памерамі і афарбоўкай галавы з вялізнай дзюбай. Калі ўсе птушкі ўзняліся ў паветра, чэгравы вылучаліся па рэзкаму «краа». Дарэчы, гэта птушка ў нас - рэдкі залётны від.

КАЛОНІЯ

Дзе яшчэ на тэрыторыі Беларусі вам надарыцца пабачыць такую вялікую калонію вялікіх бакланаў і шэрых чапляў?





Кажуць, калонія бакланаў і чапляў, што знаходзіцца ў вусці Лані, самая вялікая на тэрыторыі Беларусі. і адна з найбуйнейшых у Еўропе. Калонія знаходзілася на невялікай адлегласці ад ракі, але прабірацца да яе нам давялося праз высокія

зараснікі трыснягу і іншых незвычайна высокіх і густых раслінаў. Бераг Прыпяці каля месца ўпадзення ў яе ракі Лані разрэзаны невялікімі ярамі, што ўтварыліся патокамі адыходзячай пасля веснавога разводдзя вады. Да калоніі мы рухаліся па адным з такіх яроў. Было такое адчуванне, што трапілі ў нейкую фантастычную краіну. Па вільготнай глебе поўзалі п'яўкі, невялікія сажалкі зацягнуліся раскай, нібы дываном -зазяваешся - можаш ускочыць у твань. Наўкола выцягнуліся травы ў рост - чалавека, асабліва непрыемна было сутыкацца з крапівай, а калючыя галіны ажыны чапляліся за адзенне. Роем круціліся куслівыя слепяні і не давалі спакойна ісці. Месцамі шлях перакрывалі вялізныя паваленыя дрэвы - даводзілася пераадольваць або абыходзіць гэтыя перашкоды. Экватарыяльны лес! Не хапала толькі ліян, увіваючых дрэвы і звісаючых з іх.

Калі дабраліся да калоніі, травяністая расліннасць амаль знікла - яна не вытрымлівае такой колькасьці "ўгнаеыняў" у выглядзе птушынага памёту. Ён жа з'явіўся і асноўнай прычынай гібелі магутных дубоў і іншых дрэваў, на якіх яшчэ колькі год таму таксама разьмяшчаліся дзесяткі гнёздаў... Замест зарасцяў з'явілася новая перашкода - рэзкі пах, якім прасякнута ўсё наваколле калоніі. Смярдзелі рэшткі рыбы і прадуктаў жыццядзейнасці соцен і тысяч птушак, што назапасіліся тут за час існавання калоніі.

Відовішча, якое нам адкрылася, здзівіла не менш, чым шлях да калоніі. На дрэвах куды ні кінь позірк - гнёзды птушак: некаторыя дрэвы трымалі на сабе па некалькі дзесяткаў гнёздаў. Стаяў шум і гоман. Крычалі птушаняты бакланаў і чапляў, бо хацелі есці; крычалі дарослыя птушкі, бо гнёзды розных сям'яў знаходзіліся побач і трэба было абараніцца ад суседзяў. Напалоханыя птушкі ўзляталі ў паветра і потым ўсёй чарадой садзіліся на якое-небудзь дрэва. Раз-пораз птушаняты зрываліся з гнёздаў і, каб далучыцца да сваіх братоў, ім даводзілася выкарыстоўваць не толькі моцныя ногі, але і дзюбу, каб чапляцца за галіны і падымацца наверх. Не ўва ўсіх гэта атрымлівалася: некаторыя спрыгвалі ўніз і стараліся ўцячы ад нас па вадзе сажалак, дзе і хаваліся ў буйной прыбярэжнай расліннасці. Недзе збоку ўзняліся ў паветра арланы-белахвосты, напэўна, яны ўжо знайшлі тут сабе снеданне. Перамяшчацца пад дрэвамі, дзе знаходзіліся гнёзды з птушанятамі было не зусім прыемна: калі яны заўважалі няпрошаных наведвальнікаў, абараняліся - на галавы падала рыба, адрыгнутая птушкамі. Словам, ад чужых калонія абаранялася як магла. Пасля наведвання гэтага прытулку птушак ўражанні ад убачанага на калоніі засталіся самыя розныя і супярэчлівыя.

На наступны дзень падарожжа скончылася, але кожны ўдзельнік заставіў сабе новыя пачуцці, новыя ўражанні аб птушках, Прыпяці, Палессі, і наогул прыродзе Беларусі.



***Зінаіда Гарошка, АПБ,***
***В.Пакалюбічы, Гомельскі раён.***